18 КРАСАВІКА – МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ПОМНІКАЎ І ГІСТАРЫЧНЫХ МЕСЦАЎ

# Падарожжа па сівых мурах з Анатолем Бутэвічам

"Гродна – адна з перлін нашай краіны, зямля, якая павінна складаць славу Беларусі. Гэта каралеўскі горад", – так ахарактарызаваў наш горад выдатны пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч Анатоль Бутэвіч, які завітаў у госці да гродзенцаў. Сустрэча адбылася ў абласной бібліятэцы імя Я.Карскага. Анатоль Іванавіч расказаў аб тым, як прыйшоў да вывучэння гісторыі Радзімы, падзяліўся цікавымі легендамі аб беларускай зямлі, прэзентаваў свае кнігі, а таксама паведаміў; што робіцца ў рэспубліцы ў галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны.



## Гродна – каралеўскі горад

– Мы, беларусы, часам занадта сціплыя, нам здаецца, што ўсё чужое намнога лепшае, чым наша. Гэта далёка не так. Мы павінны навучыцца шанаваць сваё і адпаведным чынам падаваць. Перліна без аправы можа не глядзецца, не свяціцца, не іскрыцца, але калі ёй дадаць агранку, антураж, стварыць легенду, яна стане сапраўднай пярлінай не толькі ў нашай гісторыі, але і сусветнай. Гродна заслугоўвае таго ж. Калі мы будзем прапанаваць школьнікам паехаць на экскурсію менавіта ў *каралеўскі* горад Гродна, паверце, адносіны да гэтай экскурсіі будуць зусім іншыя, чым мы скажам проста Гродна. Гарадоў у Беларусі шмат, а каралеўскі адзін, праўда, калі не лічыць яшчэ Навагрудак, які быў сталіцай ВКЛ. Каралеўскі Гродна трэба прапагандаваць: не саромеючыся, не перабольшваючы, а проста гаварыць, як ёсць. Тады не толькі беларускія, але і замежныя турысты будуць ехаць сюды значна ахвотней, – кажа Анатоль Бутэвіч.



Навагрудскі замак



## Невылечная хвароба

Амаль на кожнай сустрэчы Бутэвіч жартуе: "Я захварэў, і захварэў невылечна... Але я хацеў бы, каб і ў вас, як і ў мяне, была толькі гэтая хвароба – хвароба нашай гісторыяй". Дакладней кажучы, захварэў пісьменнік на "гісторыю Вялікага княства Літоўскага ад Крэўскай да Люблінскай уніі", прысвяціў ёй шмат сваіх твораў: "Каралева не здраджвала каралю", "Таямніцы Мірскага замка: падарожжа па сівых мурах з Адамам Міцкевічам", серыю кніг "Сем цудаў Беларусі" ды іншыя.

А.Бутэвіч друкуецца з 1969 года. Аўтар гістарычных і дзіцячых кніг, п'ес, літаратурных эсэ, крытык, перакладае з польскай, украінскай і рускай моваў на беларускую. Так, дзякуючы Бутэвічу, на роднай мове выйшлі раманы Элізы Ажэшкі "Над Нёманам", "Салярыс" Лема і іншыя. П'есы ў яго перакладзе ідуць на сцэнах беларускіх тэатраў. Займаецца грамадскай дзейнасцю. Член рэдкалегіі часопіса "Вясёлка", "Краязнаўчай газеты", намеснік старшыні рады Беларускага фонда культуры, старшыня таварыства "Беларусь-Польшча", старшыня грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Анатоль Іванавіч Бутэвіч быў першым міністрам інфармацыі, а потым міністрам культуры і друку РБ.

## Каб любіць Беларусь нашу мілую…

Сёння ў моладзі ёсць магчымасць ведаць гісторыю такой, якая яна была. Бо, як кажа Анатоль Іванавіч, раней на тым самым філфаку універсітэта, дзе ён вучыўся з 1966 па 1971 год, вывучалі "Историю БССР" па танюсенькай кніжачцы. "Якое там Вялікае княства Літоўскае, вялікія князі – пра гэта і згадваць нельга было, – кажа Бутэвіч. – Я разам з сённяшняй моладдзю засвойваю гісторыю сваёй краіны. Яна настолькі багатая і шматблічная, што я для сябе адкрываю яе як чалавек, які толькі-толькі пачынае жыць у гэтай краіне. І чым больш адкрываю, тым больш разумею, што нам трэба не толькі ведаць гісторыю, але і навучыцца бачыць яе ў рэальных праявах. Не пагаджаўся са словамі "Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць", пакуль не апынуўся на працы за мяжой. Там я зразумеў нешта іншае, вось тут, у душы (паказвае на сэрца), нешта стала іншым".

## Нацыя донараў

"Мы, беларусы, – нацыя донараў. Аддалі сваіх людзей усяму свету. Без перабольшання. Ад Масквы да Вашынгтона, Чылі. Калі сёння нехта з нас здае кроў, а яна не вельмі добрая, то донарамі мы не станем. Значыць, нашы сыны былі такімі донарамі, якія былі запатрабаваны. Мы павінны разумець самакаштоўнасць у еўрапейскім кантэксце", – кажа Анатоль Бутэвіч і ўзгадвае словы Максіма Багдановіча: "На што нам жыта, калі ў ім няма валошак?" Сам Багдановіч у сваім юнацкім узросце стаяў нароўні з усёй паэтычнай супольнасцю Еўропы. Паэта не стала, калі яму было няпоўных 26 гадоў. Напэўна, такі лёс, мяркуе Анатоль Іванавіч. Байран, Пушкін, Лермантаў, Ясенін, Маякоўскі да сарака не дажылі. "Можа, сапраўды Бог забірае лепшых, але забірае дзеля таго, каб яны там сталі нашымі анёламі-ахоўнікамі, каб яны дапамагалі нам быць людзьмі на гэтай зямлі, не сысці са свайго шляху", – кажа Бутэвіч.

## Краіна замкаў

Беларусь нездарма называлі краінай замкаў, бо ў нас іх было не менш за 180. Але па нашай зямлі, як распавядае Анатоль Іванавіч, "хадзілі і ўздоўж, і ўпоперак, справа налева любыя прыхадні". Трэба было абараняцца, але ж і час не пашкадаваў гэтых замкаў. Сёння па падліках спецыялістаў іх засталося 38.

– Дзякуй Богу, што ў мінулым годзе прынята дзяржпраграма "Замкі Беларусі", якая прадугледжвае захаванне, аднаўленне замкаў там, дзе гэта магчыма. Трэба захоўваць нават курганы, у якіх засталіся рэшткі замкаў. Гэта нашыя памяткі дзён, што ў нябыт уцяклі, – кажа Анатоль Іванавіч. – Мне бывае балюча, што калі помнік застаецца без гаспадара, некаторыя ляцяць туды, кабададраць ад печы кафлю, сарваць паркетную падлогу, выдраць вокны і перанесці сабе на дачу. Навошта? Не пабагацееш. А помнік знішчаны. На жаль, сёння дзяржава з'яўляецца большым апекуном гісторыі, чым мы самыя. Напэўна, зразумеўшы патрэбу, каб і грамадства далучылася да гэтай справы, у мінулым годзе Міністэрства культуры вырашыла заняцца Навагрудскім замкам. Назіральная камісія па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры падтрымала гэтую ідэю. Аб'явілі збор сродкаў пад дэвізам "Захаваем Навагрудскі замак разам". Добрая ідэя, яна дае магчымасць адчуць сябе гаспадарамі, далучыцца да аховы. Калі мы захаваем Навагрудскі, Крэўскі, Гальшанскі замкі, будзе што передаць нашым дзецям.

Што датычыцца Навагрудскага замка, ён аднаўляцца не будзе, бо не захаваліся аб'екты, чарцяжы, малюнкі. Як расказвае А.Бутэвіч, пасля вайны з усяго горада звозілі будаўнічае смецце і засыпалі ўнутр замка, і там зараз каля 2-3 метраў звычайнага пасляваеннага друзу. З мінулага года пачаліся раскопкі. "Калі выбяруць смецце, паўстануць сцены, стане бачным аблічча былой рэзідэнцыі Міндоўга. І ў гэтым будзе наша заслуга. Бацька зможа сказаць сыну, што сюды свой рубель паклаў", – кажа Бутэвіч.

## Нельга маўкліва пазіраць

Анатоль Іванавіч занепакоены тым, што "з маўклівай згоды ўсю нашу былую гісторыю прысабечылі літоўцы. Забралі сабе, зрабілі сваёй":

– Сёння нават расійскія, украінскія і іншыя даследчыкі ў сваіх даведніках, калі пішуць пра ВКЛ, у дужках указваюць транскрыпцыю "Вітаўтас" замест "Вітаўт", Альгерд становіцца "Альгердасам", і ўсе астатнія імёны нашых вялікіх князёў пішуцца з прыдаткам "ас", што сведчыць пра літоўскае паходжанне. Літоўцы ў гэтым сэнсе не саромеюцца і лічаць Міцкевіча адназначна сваім, нават Францыск Скарына ніякі не беларус, а літовец. Калі мы будзем далей маўкліва на гэта пазіраць, то сапраўды ўсю нашу гісторыю могуць прысабечыць іншыя.



Крэўскі замак

***Вольга Кацько***

***Фота аўтара***